Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 39 (5165)
ЛЮТЫ
16
СУБОТА
1935 г.
год выдання XVIII

## СХОД МЕНСКАГА ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА

Вялікі зал пасяджэнняў Дома ўрада перапоўнен. Роўна а 7-й гадзіне сакратар Менгаркома КП(б)Б тав. Рыскін адкрывае агульнагарадскі партыйны сход. У першых словах ён успамінае пра раптоўную смерць тав. Куйбышэва. Яго памяць ушаноўваецца ўставаннем. Тав. Рыскін паведамляе таксама аб смерці інструктара ГК КП(б)Б тав. Гарагляда.

У ПРЭЗІДЫУМ АДНАГАЛОСНА ВЫБІРАЮЦЦА ЧЛЕНЫ БЮРО ЦК і ГК КП(б)Б і тт. ЛЕЙЗЕР і ІВАНОЎ. Слова для даклада аб выніках VII усесаюзнага з'езда советаў прадастаўляецца старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ. Бурнымі воплескамі сустракаюць удзельнікі схода з'яўленне тав. Галадзеда на трыбуне.

У сваім двухгадзінным дакладзе тав. Галадзед падрабязна спыніўся на рабоце з'езда і вызначыў канкрэтныя задачы, якія стаяць перад КП(б)Б у справе рэалізацыі рашэнняў з'езда.

У часе даклада тав. Галадзеда ў прэзідыуме з'яўляецца тав. Н. Ф. ГІКАЛО. Громам апладысментаў сустракаецца кіраўнік большэвікоў Беларусі.

У спрэчках па дакладу тав. Галадзеда выступілі тт. ЛЮБІН (дырэктар фабрыкі «Комунарка»), АЙЗЕНБЕРГ (завод Большэвік), КУМАНСКІ (завод імя Кірава), БАРАНСКІ (завод «1 мая»), старшыня Менскага горсовета тав. ЖУКОВІЧ і іншыя.

## БАРАЦЬБА ЗА ВЫСОКІ УРАДЖАІ ВЫРАШАЕЦЦА СЕННЯ

Сабраўшыся зараз 2-гі з'езд калгаснікаў-ударнікаў прыме новы статут сельска-гаспадарчай арцелі. Ён таксама, як і першы з'езд, адкрые вялікую старонку ў далейшым развіцці і ўздыме калгаснай вёскі, росквіце калгаснай вытворчасці, павышэнні ўраджайнасці соцыялістычных палёў, росце заможнасці і культурнасці ўсёй масы калгаснікаў.

Водгукі на даклад тав. Якаўлева аб праекце прыкладнага статута сельска-гаспадарчай арцелі, атрыманыя намі з розных калгасаў БССР, сведчаць толькі аб адным — беззаветнай адданасці калгасных мас вёскі партыі Леніна-Сталіна, аб любві к правадыру партыі і народаў Саюза, таварышу Сталіну, гатоўнасці змагацца за тыя задачы, якія зараз высоўваюцца перад сельскай гаспадаркай нашай краіны.

Задачы гэтыя надзвычай адказныя. Мы напярэдадні веснавой сяўбы. Усесаюзны з'езд советаў, які нядаўна закончыў свае работы, паставіў перад сельскай гаспадаркай адказнейшую і ганаровую задачу — павялічыць сельскагаспадарчую валавую прадукцыю ў 1935 годзе на 2,5 мільярда рублёў, або на 16 проц.

Практыка перадавых калгасаў Беларусі, якія дабіліся ўжо ў мінулым годзе высокіх ураджаяў, гаворыць аб тым, што пашырыць гэтыя ўраджаі ўсюды залежыць толькі ад нас саміх, залежыць ад нашай арганізаванасці і баявой гатоўнасці да паспяховага правядзення веснавой сяўбы.

**БССР У ГЭТЫМ ГОДЗЕ МОЖА І ПАВІННА ЗАНЯЦЬ ГАНАРОВАЕ МЕСЦА Ў РАДЗЕ РЭСПУБЛІК І АБЛАСЦЕЙ САЮЗА ПА ЎРАДЖАЙНАСЦІ І ВЫСОКАЙ ДАХОДНАСЦІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.** Гэта накладвае вялікую адказнасць на раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, абавязвае іх у бліжэйшыя дні завяршыць падрыхтоўку да вясны і ранняй сяўбы.

На жаль, трэба адзначыць, што не ўсе райкомы партыі і райвыканкомы, сельсоветы і праўленні калгасаў улічылі гэту адказнасць.

Асноўнае звяно надыходзячай сяўбы — гэта НАСЕННЕ. На 10 лютага, паводле даных Наркамзема, па БССР план засыпкі зернавых культур перавыканан. Аднак, калі больш уважліва вывучыць становішча на месцах, то ход падрыхтоўкі добраякаснага насення, якое забяспечвала б ... пасяўную плошчу,

тав. ЯКАЎЛЕВА: «Часценька ў нас больш думаюць аб тым, каб захаваць устаноўленую норму высеву па ліку пудоў, а аб тым, што сярод гэтых пудоў многа смецця — мала думаюць. Трэба прама сказаць: хто сее неачышчаным зярном, той сапраўдны дзікун, а не калгаснік, яму месца ў музеі аднаасобных дрэўнасцей... а не на калгасных грамадскіх палях».

Важнейшым участкам падрыхтоўкі да вясны з'яўляецца рамонт трактарнага парку. Між тым, па БССР рамонт трактароў недапушчальна зацягваецца. План рамонту па МТС выканан толькі на 81 процэнт. Яшчэ горш ідзе рамонт па МТМ, дзе на 10 лютага план выканан толькі на 68,6 проц. Асабліва кепска з якасцю рамонту. Многія дырэктары МТМ, МТС, соўгасаў парушаюць самыя элементарныя правілы, а іменна, што трактар і матор лічацца адрамантаванымі толькі пасля дасканалай абкаткі, праверкі і складання адпаведнага акта. На прыкладзе Полацкай МТМ і МТС, Крычаўскай МТС і інш. даволі выпукла выяўляюцца прычыны адставання і нездавальняючага рамонту трактарнага парку. Ва многіх майстэрнях дагэтуль яшчэ няма элементарнай арганізацыі працы. Зусім адсутнічае спаборніцтва паміж брыгадамі і грамадскі кантроль за якасцю работы. Профсаюзныя арганізацыі не вядуць барацьбы з прагульшчыкамі і бракаробамі, не ўзнялі на шчыт лепшых рамонтных брыгад, каб зрабіць іх вопыт здабыткам усіх.

Няма патрэбы даказваць, што ў гэтым годзе нашы рамонтныя майстэрні працуюць у непараўнаўча лепшых умовах, чым летась, значна лепшае становішча з запаснымі часткамі і кадрамі рамонтных рабочых. Значыць, галоўным чынам, **СПРАВА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД УМЕЛАГА КІРАЎНІЦТВА ДЫРЭКЦЫІ МАЙСТЭРАНЬ І ЎВАГІ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.**

Правядзенне сяўбы ў максімальна кароткія тэрміны будзе вырашаць і конская цягавая сіла. Не сакрэт, што ў радзе раёнаў БССР мы яшчэ маем злачынныя адносіны да каня. Нарком земляробства БССР тав.



Таварышы СТАЛІН, КАГАНОВІЧ і КАЛІНІН сярод дэлегатаў Маскоўскай вобласці. Сядзяць (злева направа): тт. ЕГІНА, ВАРАБ'ЕВА, БАРЫСАВА, КАРПАВА; стаяць (у першым раду): тт. ОЖЫЛАЎ, МАРЭНКАЎ, СІДАРАЎ, ЗОЛАТАЎ, МІХАЙЛІН.

### ДРУГІ УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

# *Спрэчкі па дакладу тав. ЯКАЎЛЕВА*

